УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЗАЙЦАЎ ЯЎГЕН АЛЯКСЕЕВІЧ

**ЖЫВАПІСЕЦ, НАРОДНЫ МАСТАК БССР**

**3 СТУДЗЕНЯ 1908 Г. – 13 ВЕРАСНЯ 1992 Г.**

**ФОНД № 226**

**ВОПІС № 1**

**1927–1978 гг.**

МІНСК 2019

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 226**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ФАТАГРАФІІ ТВОРАЎ Я.А. ЗАЙЦАВА І ІНШ. | 1-7 | 1 |
| 2. | ПІСЬМЫ ДА Я.А. ЗАЙЦАВА | 8-19 | 1-3 |
| 2.1. | ПІСЬМЫ МАСТАКОЎ І МАСТАЦТВАЗНАЎЦАЎ Я.А. ЗАЙЦАВУ | 8-13 | 1-2 |
| 2.2. | ПІСЬМЫ АД ІНШЫХ АСОБ Я.А. ЗАЙЦАВУ | 14-16 | 2 |
| 2.3. | ПІСЬМЫ Я.А. ЗАЙЦАВУ АД УСТАНОЎ | 17-19 | 2-3 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я.А. ЗАЙЦАВА І ІНШ. | 20-39 | 3-5 |
| 4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 40-49 | 5-6 |

## Прадмова

**Зайцаў Яўген Аляксеевіч** нарадзіўся 3 студзеня 1908 г. (21 снежня 1907 г.) у г. Невелі Віленскай губерні (цяпер Пскоўская вобласць, Расія). У 1914 г. разам з бацькамі пераехаў у г. Віцебск. У 1916 г. паступіў у падрыхтоўчы клас Аляксандраўскай гімназіі. У пачатку 1917 г. перавёўся ў прыватную гімназію І.Р. Неруша, пасля рэвалюцыі рэарганізаваную ў 1-ю савецкую працоўную школу. У 1920 г. быў прыняты ў Мастацкі практычны інстытут у майстэрню Марка Шагала. Па сямейных абставінах перапыніў навучанне і пераехаў у м. Калышкі (цяпер Лёзненскі раён, Віцебская вобласць). Перайшоў у 6 клас і ў 1924 г. скончыў школу ў г. Лёзна. У 1926 г. спрабаваў паступіць на рабочыя курсы пры Інстытуце імя А.І. Герцэна Пададдзела прафесійнай адукацыі Ленінградскага абласнога аддзела народнай адукацыі[1]. З 1926 г. да 1930 г. вучыўся ў Беларускім мастацкім тэхнікуме ў г. Віцебску (на першым курсе – на аддзяленні керамікі, з другога – на аддзяленні жывапісу) у В.В. Волкава, М.А. Керзіна, М.В. Лебедзевай, М.П. Міхалапа. Летам–восенню 1930 г. працаваў мастаком-афарміцелем на Мінскай сельскагаспадарчай выстаўцы. У студзені 1931 г. быў накіраваны Наркамасветы БССР на навучанне ў Інстытут пралетарскага выяўленчага мастацтва ў г. Ленінградзе (цяпер – Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны акадэмічны інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Я. Рэпіна). Першыя два гады займаўся на аддзяленні манументальнага жывапісу ў К.С. Пятрова-Водкіна, наступныя – станкова-бытавога жывапісу ў А.А. Асьмёркіна. У снежні 1937 г. скончыў інстытут і вярнуўся ў г. Мінск, дзе з 1938 да 1941 гг. узначальваў Курсы па павышэнні кваліфікацыі маладых мастакоў. У [1941]–1942 гг. служыў інжынерам-маскіроўшчыкам і тэхнікам-інтэндантам І рангу аператыўнага аддзялення штаба 38-й сапёрнай брыгады [Беларускі фронт]. У 1943–1944 гг. знаходзіўся ў распараджэнні Беларускага штаба партызанскага руху ў г. Масква, удзельнічаў у афармленні выданняў “Партизанская дубинка” і сатырычнай газеты-плаката “Раздавим фашистскую гадину”. З другой паловы 1940-х гг. знаходзіўся на творчай працы.

У 1931 г. выканаў першую манументальную работу – фрэску “Собрание в колхозе”. З 1935 г. удзельнічаў у рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных выстаўках. Працаваў у жанрах: сюжэтна-тэматычная карціна (“Чапаев” (1937), “Вступление Красной Армии в Минск в 1920 году” (1940), “Похороны героя” (1946), “Парад партизан в 1944 году в Минске” (1947), “Приезд В.И. Ленина в Петроград в апреле 1917 года” (1946–1947), “Оборона Брестской крепости в 1941 году” (1950), “Константин Заслонов” (1957), трыпціх “Моя республика в огне Отечественной” (1966–1967), “Реквием. Клятва Ильичу” (1970) і інш.); партрэты (“Портрет народной артистки БССР Александры Николаевой” (1943), “Портрет юного партизана” (1943), “Портрет Героя Социалистического труда А.И. Стыкут” (1948), “Портрет лауреата Сталинской премии поэта Максима Танка” (1948), “Портрет

---

[1] Звесткі пра 1920–1926 і 1937 гг. сустракаюцца толькі ў манаграфіі П.М. Герасімовіча “Евгений Алексеевич Зайцев” (1958) (БДАМЛМ, Ф. 301, Воп. 1, Спр. 2, С. 3–6).

свинарки А.И. Чернявской” (1954) і інш.); пейзажы (“Пейзаж с рекой” (1945), “Абхазия. Эвкалиптовая роща” (1948), “Осень. Кавказ” (1949), “Припять” (1955), “Опушка леса” (1957) і інш.); выканаў роспіс фае Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР (1940) (страчаны), у сааўтарстве з І.Ц. Ціханавым аформіў інтэр’ер і экстэр’ер кінатэатра “Пионер” у г. Мінску (1964/1965).

З 1940 г. сябра Саюза мастакоў БССР, у 1948–1951 гг. старшыня яго праўлення. З 1963 г. – народны мастак БССР, з 1973 г. – член-карэспандэнт Акадэміі мастацтваў СССР.

Узнагароджаны ордэнамі “Дружба народов”, “Знак Почёта” (двойчы), Кастрычніцкай рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі (у т.л. “За оборону Москвы”), пяцццю ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета СССР.

Я.А. Зайцаў памёр 13 верасня 1992 г. Пахаваны ў г. Мінску.

Творы Я.А. Зайцава знаходзяцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь і фондах БСМ. Асабістая справа мастака перададзена з Беларускага саюза мастакоў у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Дакументы Я.А. Зайцава паступілі ў БДАМЛМ ад самога мастака ў 1978 г. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 49 спраў (118 дак.) за 1927–1978 гг.

Вопіс складаецца з 4 раздзелаў:

У першым раздзеле – “Фатаграфіі работ Я.А. Зайцава і інш.” – справы сфарміраваны па жанрах і храналогіі за 1940–1975 гг. Тут змешчаны рэпрадукцыя і фатаграфіі малюнкаў на ваенную тэму, партрэтаў, пейзажаў і інш. і артыкул. Усяго 18 дак.

Другі раздзел – “Пісьмы да Я.А. Зайцава” – складаецца з 3-х падраздзелаў: пісьмы ад мастакоў, мастацтвазнаўцаў і інш., пісьмы ад іншых асоб і пісьмы ад устаноў. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па алфавіце краін і карэспандэнтаў, унутры – па храналогіі (1942–1974).

У трэці раздзел – “Дакументы да біяграфіі Я.А. Зайцава” – увайшлі асабістыя дакументы Я.А. Зайцава, дакументы пра яго і з яго ўпамінаннем. Справы сістэматызаваны па храналогіі (1941–1978).

У чацвёртым раздзеле – “Выяўленчыя дакументы” – справы сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе (1927–[1975]).

Прадмову склала
Вядучы архівіст В.Ф. Шаталава

18.08.2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ФАТАГРАФІІ ТВОРАЎ Я.А. ЗАЙЦАВА І ІНШ.** | | | | |
| 1 | "Евгений Онегин". Фатаграфія роспісу фае Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР | [1940] | 1 | 1 | |
| 2 | "Константин Заслонов", "Оборона Брестской крепости", "Парад партизан в 1944 году в Минске" і інш. Фатаграфіі малюнкаў на ваенную тэму. Рэпрадукцыя малюнка на ваенную тэму. Выразка з часопіса | 1942-1975 | 8 | 8 | |
| 3 | "Портрет народной артистки БССР Александры Николаевой", "Портрет ткачихи из деревни Неглюбка", "Портрет юного партизана" і інш. Фатаграфіі малюнкаў | 1943-1975 | 6 | 6 | |
| 4 | "Вечер на Днепре", "Дубы над Припятью" і "Лесная дорога". Фатаграфіі пейзажаў | 1953-1975 | 3 | 3 | |
| 5 | "Албанка" і "Албанская цыганка". Фатаграфіі малюнкаў з нізкі "Албанский цикл" | 1958 | 2 | 2 | |
| 6 | Паштоўкі з рэпрадукцыямі "Албания. Гидростанция им. Карла Маркса", "На полянке" і інш. На адной - навагодняе віншаванне ад "Жэні, Рэні, Тані і інш." Р.І. Пяроўскай | 1958-1962 | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 7 | Артыкул Я.А. Зайцава пра выстаўку індыйскага малюнка ў БССР. Аўтарызаваны машынапіс | [1960-я - 1970-я гг.] | 3 | 1 | |
| | **2. ПІСЬМЫ ДА Я.А. ЗАЙЦАВА** | | | | |
| | **2.1. ПІСЬМЫ МАСТАКОЎ І МАСТАЦТВАЗНАЎЦАЎ Я.А. ЗАЙЦАВУ** | | | | |
| 8 | Пісьмо мастака-самавукі М.М. Федарэнкі Я.А. Зайцаву | 1948 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 9 | Пісьмо за подпісам ["Цемашковіч"] Я.А. Зайцаву з упамінаннем [М.М. Грыцэнкі]. Расія | 1942 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 10 | Пісьмы М.М. Грыцэнкі Я.А. Зайцаву. Расія | [сяр. 1940-х гг.] -1948 | 5 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 11 | Пісьмы мастакоў А.У. Касакоўскага (2), Ф.А. Мадорава, А.П. Мазалёва і інш., скульптара М.К. Керзіна Я.А. Зайцаву. Расія | 1945 - [да 1975 г.] | 11 | 6 | |
| 12 | Пісьмо мастака Ф. Круглянскага Я.А. Зайцаву з адначасовым зваротам да П.Н. Гаўрыленкі і Я.Я. Красоўскага. Чэхія | 1945 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | Пісьмы мастацтвазнаўцаў Л.С. Зінгера (2) і [Туроўнікава] Я.А. Зайцаву. Расія | 1960-1974 | 5 | 3 | |
| | **2.2. ПІСЬМЫ АД ІНШЫХ АСОБ Я.А. ЗАЙЦАВУ** | | | | |
| 14 | Пісьмо былога аднакласніка І. Калашнікава Я.А. Зайцаву. Расія | 1964 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 15 | Пісьмы былога партызана "Спецатрада № 18 К.С. Заслонава" Ф. Сцёпіна Я.А. Зайцаву з каментарыямі да яго карціны "Константин Заслонов" | 1968 | 3 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 16 | Пісьмо школьніка-калекцыянера М. Леппа Я.А. Зайцаву з просьбай даслаць аўтограф і накід любой работы мастака. Эстонія | 1965 | 1 | 1 | |
| | **2.3. ПІСЬМЫ Я.А. ЗАЙЦАВУ АД УСТАНОЎ** | | | | |
| 17 | Пісьмо [дырэктара Гістарычнага музея г. Крычава М.Ф. Мельнікава] Я.А. Зайцаву па пытанні куплі замалёвак і эскізаў яго работ | [пасля 1960 г.] | 1 | 1 | |
| 18 | Пісьмо 1-га намесніка старшыні праўлення СП БССР І.П. Шамякіна Я.А. Зайцаву з просьбай напісаць успаміны аб П.Ф. Глебку да рыхтуемага выдавецтвам "Мастацкая літаратура" выдання | 1972 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 19 | Пісьмо намесніка кіраўніка Галоўнага ўпраўлення ўстаноў выяўленчых мастацтваў пры СНК СССР І.М. Барашкі Я.А. Зайцаву з запрашэннем да ўдзелу ва Усесаюзнай мастацкай выстаўцы, | [1951], 1972 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | прысвечанай 35-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. Расія. Пісьмо старэйшага навуковага супрацоўніка аддзела выставак Усесаюзнага вытворча-мастацкага камбіната Міністэрства культуры СССР Л. Вараб'ёва Я.А. Зайцаву з запрашэннем да ўдзелу ў зводным каталозе франтавых малюнкаў мастакоў-удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Расія | | | | |

**3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я.А. ЗАЙЦАВА І ІНШ.**

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 20 | Пастанова СНК БССР "Аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы да Усесаюзнай мастацкай выстаўкі "Наша родина" і рэспубліканскай выстаўкі маладых мастакоў" | 26 красавіка 1941 г. | 1 | 1 | |
| 21 | Камандзіровачнае пасведчанне Саюза савецкіх мастакоў БССР для паездкі ў г. Маскву і паказа свайго эскіза ў Аргкамітэце Саюза савецкіх мастакоў СССР на імя Я.А. Зайцава | 19 чэрвеня 1941 г. | 1 | 1 | |
| 22 | Характарыстыкі на Я.А. Зайцава за подпісам старшыні Саюза савецкіх мастакоў БССР А.В. Грубэ, члена прэзідыума Аргкамітэта Саюза савецкіх мастакоў СССР В.М. Якаўлева і інш. для прадастаўлення ў 5-е Армейскае Упраўленне Войскаў урадавай сувязі Заходняга фронту і інш. | 1941, 1942 | 2 | 2 | |
| 23 | Дакументы аб службе інжынера-маскіроўшчыка, тэхніка-інтэнданта І рангу аператыўнага аддзялення штаба 38-й сапёрнай брыгады Я.А. Зайцава (даведка аб прыняцці на захаванне ў брыгадзе яго асабістых рэчаў, хадайніцтва Саюза савецкіх мастакоў СССР аб стварэнні для Я.А. Зайцава ўмоў для творчай працы і дазволе на яго прыезд у г. Маскву для паказу эскізаў да выстаўкі выяўленчага мастацтва БССР і інш.) | 1942 | 3 | 3 | |
| 24 | Запрашальны білет Усеславянскага Камітэта на ІІІ Усеславянскі мітынг ў Калоннай зале Дома Саюзаў у г. Масква на імя Я.А. Зайцава | 1943 | 3 | 1 | |
| 25 | Пасведчанні аб службе ў складзе Беларускага штаба партызанскага руху на імя Я.А. Зайцава | 1943, 1944 | 2 | 2 | |
| 26 | Пасведчанне СНК БССР аб скіраванні брыгады мастакоў для работы ў г. Магілёве і г. Мінску на імя Я.А. Зайцава з адначасным упамінаннем А.В. Аладавай і М.З. Беляніцкага | 15 ліпеня 1944 г. | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 27 | Камандзіровачнае пасведчанне Камісіі па гісторыі Айчыннай вайны пры ЦК КП(б)Б для паездкі ў г. Бабруйск, г. Віцебск, г. Магілёў і г. Оршу і напісання там замалёвак баявых мясцін для Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на імя Я.А. Зайцава | 13 кастрычніка 1944 г. | 1 | 1 | |
| 28 | Ганаровая грамата Камітэта па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў СССР, Цэнтральнай ваенна-шэфскай камісіі і інш. за заслугі ў галіне культурнага шэфства над Узброеннымі сіламі СССР на імя Я.А. Зайцава.<br>Граматы і загады аб уручэнні нагруднага значка і памятнага медаля і інш. Міністэрства абароны СССР і інш. за стварэнне мастацкіх твораў на ваенна-патрыятычную тэму і інш. | 1948-1968 | 9 | 7 | |
| 29 | Дазвол Міністэрства дзяржаўнай бяспекі БССР на работу над эцюдамі да карціны "Автозавод - новостройка коммунизма" на Мінскім аўтамабільным заводзе на імя Я.А. Зайцава і адначасна на імя А.В. Волкава і Н.М. Воранава | 1951 | 1 | 1 | |
| 30 | Пасведчанні Галоўнага ўпраўлення па справах мастацтваў Міністэрства культуры БССР аб праве работы над пейзажамі і замалёўкамі на месцах "гістарычных падзей Вялікай Айчыннай вайны" і "аднаўлення і будаўнійцтва ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры на тэрыторыі БССР" на імя Я.А. Зайцава | 1953, 1957 | 2 | 2 | |
| 31 | Грамата Саюза савецкіх таварыстваў сяброўства і культурнай сувязі з замежнымі краінамі "за актыўную работу па ўмацаванню сяброўскіх і культурных сувязей з замежнымі краінамі" на імя Я.А. Зайцава | пасля 1958 г. | 1 | 1 | |
| 32 | Пастановы Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў культуры і інш. аб аб'яўленні падзякі "за актыўны ўдзел у рабоце па культурнаму шэфству над Узброеннымі Сіламі СССР" і з нагоды 20-годдзя перамогі СССР у Вялікай Айчыннай вайне і 50-годдзя Узброенных Сіл СССР на імя Я.А. Зайцава | 1964, 1968 | 2 | 2 | |
| 33 | Справаздача Я.А. Зайцава аб творчай паездцы ў Албанію.<br>Аўтарызаваны машынапіс | 1959 | 4 | 1 | |
| 34 | Афіша мастацкай выстаўкі Я.А. Зайцава, Ю.П. Рэйнэра і Р.С. Ханджана "По Албании" ў | 1959 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | павільёне Цэнтральнага парка культуры і адпачынку імя М. Горкага ў г. Масква | | | | |
| | * * * | | | | |
| 35 | Каталог выстаўкі твораў Я.А. Зайцава, прысвечанай 50-годдзю з дня нараджэння і 25-годдзю яго творчай дзейнасці. Друкаванае выданне. Спіс работ Я.А. Зайцава да неўстаноўленай выстаўкі. Рукапіс Я.А. Зайцава | 1959, [кан. 1950-х - 1960-я гг.] | 28 | 2 | |
| 36 | Артыкулы і нататка, прысвечаныя 60- і 70-годдзю з дня нараджэння Я.А. Зайцава. Выразкі з газет | 1968-1978 | 5 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 37 | "Е.А. Зайцев". Буклет выдавецтва "Советский художник" | 1949 | 4 | 1 | |
| 38 | Артыкулы і нататка, прысвечаныя Я.А. Зайцаву і яго творчасці. На албанскай, беларускай і рускай мовах. Газета "Bashkimi" (№ 225, 1958), выразкі з газет | 1958-1976 | 5 | 4 | |
| 39 | Фельетон і нататкі аб удзеле беларускай дэлегацыі ва Усесаюзным з'ездзе мастакоў у г. Масква, візіце савецкіх дзеячаў культуры ў Албанію і Венгрыю і інш. (у т.л. з упамінаннем Я.А. Зайцава). На албанскай, беларускай, вянгерскай і рускай мовах. Газеты "Bashkimi" (№ 219, 1958) і "Naplo" (ад 25.09.1964), выразкі з газет | 1947-1964 | 9 | 5 | |
| | **4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 40 | Фатаграфіі Я.А. Зайцава, індывідуальныя | 1958, [1960-я - пач. 1970-х гг.] | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 41 | Фатаграфія Я.А. Зайцава ў групе з членамі Бюро камсамола Віцебскага мастацкага тэхнікума: Афанас'евым, П.Н. Гаўрыленкам і інш. | 1927 | 1 | 1 | |
| 42 | Фатаграфіі Я.А. Зайцава ў групах з І.В. Ахрэмчыкам, А.А. Волкавым, П.Н. Гаўрыленкам, М.І. Гусевым, О.П. Марыксам і інш. у майстэрні | [1930-я гг.]-[1938] | 3 | 3 | |
| 43 | Фатаграфіі Я.А. Зайцава ў групах з З.І. Азгурам, А.В. Аладавай, М.Л. Бельскім, А.А. Бембелем, | 1950-[1975] | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | П.Н. Гаўрыленкам, М.П. Станютам і інш. на V з'ездзе і пасяджэнні Саюза мастакоў БССР і інш. | | | | |
| 44 | Фатаграфія Я.А. Зайцава з І.Ц. Ціханавым у фае кінатэатра "Пионер" у г. Мінску пасля заканчэння работ па афармленні яго інтэр'ера і эсктэр'ера | 1964/1965 | 1 | 1 | |
| 45 | Фатаграфіі Я.А. Зайцава ў групах з З.І. Азгурам, А.В. Багатыровым, А.А. Бембелем, П.У. Броўкам, Г.М. Бураўкіным, У.С. Караткевічам, А. Маўзонам, Д. Сімановічам і інш. у час святкавання 1000-годдзя г. Віцебска | 1974 | 5 | 5 | |
| | *                 *                 * | | | | |
| 46 | Фатаграфіі Я.А. Зайцава ў групе з І.В. Ахрэмчыкам, [П.Н. Гаўрыленкам], Я.Я. Красоўскім, [У.М. Кудрэвічам] і інш. на партызанскай базе на станцыі Стрэльня пад г. Масквой | [1943] | 1 | 1 | |
| 47 | Фатаграфіі Я.А. Зайцава ў групах з Ж. Вермеш-Торэз, В. Вольскім, Ю.П. Рэйнэрам, М. Торэзам, Р.С. Ханджанам і інш. у час знаходжання ў Албаніі, Венгрыі і інш. | 1958-[1961] | 8 | 6 | |
| 48 | Фатаграфіі Я.А. Зайцава ў групах з А.А. Бембелем, Л.П. Грыгарашчанкам, Ф.А. Мадоравым і інш. у час знаходжання ў Малдове і Расіі | [пач. 1950-х гг], [пач. 1960-х гг.] | 2 | 2 | |
| | *                 *                 * | | | | |
| 49 | Фатаграфіі Я.А. Зайцава ў групе з піянерамі і інш. | [кан. 1940- гг.], 1960-я гг. | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 49 (сорак дзевяць)

спраў з № 1 па № 49 , 118 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

_____________________

_____________________

"_____"____________20____ г.